НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

**№ 13 (81), ЖНІВЕНЬ 2009 ГОДА**

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

# Патрыятызм раённага маштабу

Завершылася першае паўгоддзе, якое падводзіць рысу пад выкананнем прагнозных паказчыкаў. З якімі вынікамі сацыяльна-эканамічнага развіцця наш раён выйшаў на адрэзак новага часу? Як мы справіліся з пастаўленымі на гэты перыяд задачамі, якія планы мы будуем па далейшаму правядзенню мерапрыемстваў у прызначаны Год роднай зямлі? Аб гэтым ішла размова на чарговым пасяджэнні райвыканкама напрыканцы ліпеня, якое ўзначаліў кіраўнік раённай адміністрацыі В. А. Падляшчук. Чым наш рэгіён можа ганарыцца, падводзячы вынікі адыходзячага паўгоддзя, які патэнцыял застаўся ў рэзерве, якіх пралікаў не ўдалося пазбегнуць – аналіз дасягненняў і недапрацовак ў сваім выступленні дала старшыня раённага Савета дэпутатаў І. М. Новікава. Ёсць поспехі па многіх пазіцыях – у цэлым забяспечаны рост аб'ёмаў вытворчасці, запланаванымі тэмпамі ідуць асноўныя сельскагаспадарчыя работы. Асабліва пільны кантроль узяла на сябе выканаўчая галіна ўлады за ходам нарыхтоўкі кармоў, уборцы ўраджаю, сяўбы азімых культур. А ў якасці прыярытэтнага накірунку старшыня раённага штаба па правядзенню Года роднай зямлі Ірына Мікалаеўна Новікава выдзеліла шэраг пытанняў, ад вырашэння якіх залежыць дабрабыт кожнага жыхара раёна. На яе думку, гэта праблема будзе вырашана станоўча пасля правядзення шматлікіх грамадскіх акцый і мерапрыемстваў па гісторыка-патрыятычнаму выхаванню, культурна-асветніцкай і экалагічнай дзейнасці. Для гэтага спатрэбіцца вучэбны дапаможнік "Наша Шуміліншчына", які практычна падрыхтаваны да выдання. Хутка выйдзе ў свет другое перавыданне кнігі "Памяць" – гісторыка-дакументальнайхронікі Шумілінскага раёна. У сваім дакладзе І. М. Новікава выказала занепакоенасць недастатковымі напрацоўкамі ў ідэалагічнай рабоце. Да прыкладу, амаль зусім не вядзецца ніякай працы па прапагандзе і рэкламе гісторыка-культурнай спадчыны і прыродных багаццяў раёна. Мала хто ведае пра сцяг і герб нашага раёна, няма ў продажу адпаведных друкаваных матэрыялаў і сувенірнай прадукцыі, з дапамогай якіх можна было б распаўсюджваць веды пра Шуміліншчыну. Шумілінскі край вельмі пацярпеў у часы ваеннага ліхалецця. На нашай тэрыторыі засталося нямала помнікаў і абеліскаў савецкай эпохі. І яны патрабуюць дагляду. За апошні час адрамантавалі 15 вайсковых пахаванняў. Зараз распачаліся рамонтныя работы па аднаўленню помнікаў у Язвіне і Крывым Сяле. Усяго на рэканструкцыю комплекса могілак, помнікаў і абеліскаў пайшло 40 мільёнаў рублёў. Але сродкаў не хапае: шматвайсковых пахаванняў трэба рамантаваць на тэрыторыі Сіроцінскага, Дабейскага, Обальскага і Мікалаеўскага сельсаветаў. А хто будзе праводзіць штотыднёвы дагляд за тэрыторыяй савецкіх святых месцаў? Тут трэба прымушаць на гэтыя работы хаця б школьнікаў, таму што добраахвотна насельніцтва не жадае прымаць удзел ні ў якіх акцыях. Мясцовы люд больш заклапочаны "скурна-каўбаснымі" інтарэсамі, кожны хоча мець крутую "мабілу", поўную чарку, шкварку, інамарку. У пасіўных паводзінах, раўнадушшы, абыякавасці большасці простых людзей да культуры і духоўных каштоўнасцях наогул вінавата сама цяперашняя ўлада. Цяжка паверыць у тое, што арганізацыі і чальцы працоўных калектываў добраахвотна пералічылі на добраўпарадкаванне 36,4 мільёнаў рублёў. Разам з тым засталося і шмат недахопаў. Не паўсюдна і ў прызначаныя тэрміны абкошаны прыдарожныя палосы. Засмечваюцца аўтобусныя прыпынкі. Надоечы вылавілі некалькі дзяўчат-падлеткаў, якія псавалі сцены аўтобуснага прыпынку ў Крупчыне. Іх бацькоў пакаралі штрафам – на гэтым справа і скончылася. Ды і самі чыноўнікі, маючы грошы, не прыкладаюць намаганні для таго, каб людзі не бадзяліся. З 40 мільёнаў рублёў, якія былі выдзелены на арганізацыю другаснай занятасці, асвоена ўсяго толькі 9,3. Мала пабудавана дзіцячых, гульнявых і спартыўных пляцовак, а тыя што ёсць, знаходзяцца ў бядотным стане. Да таго ж адсутнічае кантроль за падтрыманнем санітарнага парадку: службоўцы сельсаветаў і камунгаса не робяць падворны абход. Дзіўна і прыкра становіцца ад таго, што не дачакаліся абяцанай прыгажосці. Вясной пасадзілі 329 тысяч штук расады кветак, а што атрымалі? Там, дзе за імі сачылі, нешта вырасла. Дзе не было пільнай увагі, засталіся закінутыя клумбы. Няўжо нашаму народу вечна патрэбна нейкая жалезная рука, якая будзе прымушаць кожнага чалавека выконваць элементарныя нормы прыстойных паводзін? Як пазбавіцца ад выпадкаў першабытнага дзікунства? Безумоўна, міліцыянера каля кожнага слупа не паставіш, а старшыня сельсавета не будзе напамінаць кожнаму жыхару аб тым, каб той прывязаў сабаку ці забіў дзірку на плоце. Аднак, па ўсяму відаць, што мноства пытанняў пакінута на самацёк. Адны́мі загадамі і карнымі метадамі парадак не навядзеш. Трэба мяняць падыходы. Любая ўлада, якая не імкнецца да ісціны, кожны дзень хлусіць цэламу народу, прыгнятае ініцыятыўных людзей, ня здольная да пазітыўных пераменаў. Дзяржава, створаная аўтарытарным рэжымам, рана ці позна, але абавязкова развaліцца. Як шумілінцы будуць любіць Бацькаўшчыну і свой край, калі з будынка райвыканкама знялі сімвалы нацыі: беларускі сцяг і герб, а замест іх павесілі крыху перааробленую, але па-сутнасці ўсё тую ж старую савецкую сімволіку?

**Алесь Шумскі.**

# Знайсці свой асяродак

Як жывецца людзям з абмежаванымі магчымасцямі ў сельскай глыбінцы? Жыццё інвалідаў найчасцей залежыць ад канкрэтных людзей, якія жывуць і працуюць побач з імі. Здаровыя просяць у бога міру і спакою для краіны, а хворыя павышанай увагі і здароўя. Шумілінская раённая арганізацыя грамадскае аб'яднанне "Беларускае таварыства інвалідаў" жыве вельмі актыўным і багатым духоўным жыццём. У наш дынамічны век вельмі няпроста змірыцца з уласнымі фізічнымі недахопамі, а яшчэ больш складана знайсці кантакты з іншымі інвалідамі. Бо толькі тады з'яўляецца адчуванне, што "я не адзін такі". І многія ўсё ж вырашылі падобныя праблемы дзякуючы старраннай працы старшыні арганізацыі інвалідаў Л. М. Нагібавай. Яна падказвае чальцам арганізацыі чым займацца і захапляцца. Добры арганізатар і вопытны псіхолаг, Любоў Мікалаеўна ўспрымае сітуацыю адэкватна. Сапраўды, можна бясконца нагадваць, што вялікі кампазітар Бетховен быў глухі, а ў знакамітага футбаліста Гарынча адна нага была карацей за другую на 12 сантыметраў. Але гэта адзінкавыя прыклады на мільярды. А ў звычайным жыцці людзям змогуць дапамагчы самыя простыя рэчы: цёплае слова, нейкі чыста сімвалічны падарунак. 4 жніўня Л. М. Нагібава ладзіла ў кафэ "Блюз" клубны агеньчык "Добры час". На сустрэчу былі запрошаны 23 юбіляры – людзі рознага ўзросту з абмежаванымі магчымасцямі. Завітала на агеньчык і прадстаўніца абласнога ўпраўлення Л. Г. Патапава. Яна прывезла пахвальныя лісты удзельнікам фестывалю творчасці інвалідаў. А юбіляры вярнуліся дадому з падарункамі і прыемнымі ўражаннямі ад сустрэчы. Свой крыж праз нялёгкае жыццё яны нясуць дастойна і з аптымізмам глядзяць у будучыню.

**У. Арэшкін.**

# І ў завода бывае дзень народзінаў

Сёлета жыхароў пасёлка Обаль напаткала двайное свята: дзень будаўніка і 80-годдзе Обальскага керамічнага завода. Гэта прадпрыемства з'яўляецца асаблівым гонарам раёна. Дастаткова толькі ўспомніць, што обальская цэгла разыходзіцца па ўсёй абшары постсавецкіх краін. Закладзены нашы цаглінкі на доўгія гады і ў крамлёўскія муры, і ў храм Хрыста Збавіцеля на Паклонный гары ў Маскве. З гэтай нагоды ў пасёлку адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы. У летнім амфітэатры сабралася кіраўніцтва завода, спецыялісты, рабочыя, прыбылі госці з раёна і вобласці. Першым слова ўзяў дырэктар завода М. Р. Скамарохаў. Мікалай Рыгоравіч адзначыў, што цяпер завод перажывае складаны перыяд – сусветны крызіс закрануў і обальскае прадпрыемства. Аднак кіраўніцтва завода ўпэўнена, што з дапамогай перадавых сучасных тэхналогій прадукцыя завода будзе запатрабавана на рынку. А гэта азначае, што не будзе масавых звальненняў у працоўным калектыве. Затым працоўны калектыў віншавалі за плённую працу намеснік старшыні райвыканкама В. А. Байда, старшыня віцебскага абласнога саюза наймальнікаў А. Г. Каралёў, старшыня Обальскага сельсавета М. Л. Петручэня, дырэктар Обальскай сярэдняй школы А. М. Штокін. Запрасілі на свята і ветэранаў працы, пры гэтым былым дырэктарам былі ўручаны каштоўныя падарункі. Жыхары Обалі святкавалі юбілей завода ў парку. Тут для іх працавалі атракцыёны, райспажыўтаварыства прапанавала пакупнікам розныя прысмакі і ласункі. На сцэне быў дадзены канцэрт самадзейных артыстаў обальскіх і шумілінскіх Дамоў культуры. Хочацца верыць, што наш "флагман" шумілінскай эканомікі чакае лепшая будучыня. Віншуем і мы ўсіх работнікаў керамічнага завода са святам і пажадаем удачы ў працы, добрага настрою, моцнага здароўя, фінансавага дабрабыту і шчасця!

**А. Прылуцкі.**

# РАЗВІЦЦЁ ГАНДЛЁВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Каб павялічыць розьнічны тавараварот, трэба пашыраць агульную сетку гандлёвых плошчаў па ўсяму раёну. Зразумела, што з-за невялікай колькасці насельніцтва ў райцэнтры нявыгадна будаваць буйныя гандлёвыя цэнтры – супермаркеты і гіпермаркеты. Аднак і ў Шуміліне жыццё на месцы не стаіць. Гандлёвыя арганізацыі ў нашым раёне развіваюцца ўпоравень з часам. Бясспрэчна, да ўкаранення прагрэсіўных формаў і метадаў продажу тавараў з аказаннем шырокага спектра паслуг яшчэ далёка. Праўда і тое, што своечасова праводзіцца рамонт і рэканструкцыя ўжо існуючых аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. Тым не менш на Шумілінщчыне паступова ствараюцца новыя розьнічныя гандлёвыя кропкі. Сярод сучасных а'б'ектаў грамадскага харчавання асаблівай увагі заслугоўвае адкрыццё кафэ прыдарожнага сервісу "Караван". Даўно наспеў час такой формы абслугоўвання насельніцтва.. Раней у Шуміліне і Обалі дзверы для пакупнікоў расчынялі прыдарожныя магазіны, як адноўленыя, так і пабудаваныя на новым месцы. Звычайна крамы такога тыпу працавалі без абедзенага перапынку і без выхадных. А кафэ "Караван" працуе з 9 гадзін раніцы да 3-х гадзін ночы. Кіраўнік райвыканкама В. А. Падляшчук, які ўдзельнічаў ва ўрачыстым адкрыцці кафэ, заверыў прысутных, што гэты аб'ект зможа прывабіць да сябе мясцовых жыхароў і гасцей раёна. Павіншаваўшы гаспадыню кафэ В. А. Манукян, Вальдэмар Антонавіч перадаў ёй сімвалічны ключ. Падзея важкая яшчэ і тым, што пры аб'екце створана 19 дадатковых рабочых месцаў. А нам застаецца толькі пажадаць прадаўцам плёну ў рабоце, мноства пакупнікоў і добрай выручкі.

**Я. Вайтовіч.**

**Вынікі апошняга апытання на сайце http://haradok.belarda.org/**

**Ці лічыце Вы суды незалежнымі ад вертыкалі?**

| | |
|---|---|
| Так | 14% |
| Так, але сумняваюсь | 4% |
| Залежаць часткова | 8% |
| Поўнасцю залежаць | 72% |
| Ня ведаю | 2% |

# АБ'ЯВА

***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску.***

***Рэдакцыя газеты «Світа-нак» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.***

***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанак».***

# НА ТОЕ ЯНЫ І АБЯЦАНКІ...

У аграгарадок Амбросавічы завітаў адзін з кіраўнікоў вышэйшых эшалонаў прэзідэнцкай вертыкалі – дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Віцебскай сельскай акрузе № 21 Васіль Міхайлавіч Байкоў. У сельскім Доме культуры адбылася сустрэча дэпутата з выбаршчыкамі. У клуб былі запрошаны кіраўнік сельгаспрадпрыемства СВК "Прыазёрны" В. В. Юхнавец, намеснік старшыні райвыканкама А. М. Мядзвецкі, дэпутат Дабейскага сельсавета М. П. Ліскоў, рэдактар раённай газеты "Герой Працы" Аліна Пятрова. Галоўным пытаннем, якое набалела не толькі выбаршчыкам, але і раённым уладам, была праблема ацяплення шматпавярховых дамоў у вёсцы Амбросавічы. Гэтыя дамы дзесяць гадоў таму належалі калгасу, былі падключаны да калгаснай кацельнай. Калі калгас канчаткова развaліўся і трапіў пад узбуйненне, дамы перадалі на баланс УП ЖКГ. Кацельня на той час ужо прыйшла ў заняпад, а грошай на яе рэканструкцыю не выдзелілі. Тады мясцовая адміністрацыя не прыдумала нічога лепшага, як дазволіць жыхарам шматпавярховак будаваць ў кватэрах грубкі. Людзі, каб не замерзнуць, пачалі ратавацца ад холаду. Будавалі з цэглы грубкі: ламалі ў кватэрах сцены, прабівалі столь - трэба ж было некуды выводзіць дым. Але такое ацяпленне аказалася малаэфектыўным: колькі дроў не спальвай, усё роўна вышэй +12-14 градусаў тэмпература ў кватэры не падымалася – дом стары, панэльнага тыпу, складзены яшчэ ў пачатку 80-х гадоў. У мінулым годзе вяскоўцам нарэшце пашчасціла: пачалося будаўніцтва аграгарадка. Начальства неаднаразова абяцала людзям, што будзе праведзена бясплатная газіфікацыя не толькі новых дамоў, але і старых шматпавярховах. І правілі: газавыя катлы ўстанавілі ўсяго ў некалькіх новых асабняках. Такія адносіны да справы выклікалі ў людзей абурэнне. Пачалася барацьба за сацыяльную справядлівасць: каля трох дзесяткаў жыхароў цэлы год падавалі скаргі і калектыўныя зварoты ў розныя інстанцыі. Чыноўнікі арганізавалі кругавую абарону: перакладвалі вырашэнне праблемы з адной арганізацыі на другую, а затым памянялі тактыку і перайшлі на адпіскі. У рэшце рэшт з невырашальнай для раённай улады праблемай жыхары звярнуліся да дэпутата "Палаткі" В. М. Байкова. Васіль Міхайлавіч на сустрэчы паведаміў сельскім выбаршчыкам, што кіраўнікі раёна ведаюць пра іх бядотнае існаванне і гэта сітуацыя яго асабіста вельмі непакоіць. Намеснік старшыні райвыканкама не стаў займацца дэмагогіяй і выказаўся больш канкрэтна. А. М. Мядзвецкі цвёрда заявіў, што грошай на газіфікацыю дамоў патрэбна каля 400 мільёнаў рублёў, а такіх сродкаў у раёне няма. Разгарэлася дыскусія. Выбаршчыкі, асабліва жанчыны-пенсіянеркі пачалі вінаваціць начальства ў неэфектыўным укладані дзяржаўных сродкаў. Маўляў, навошта столькі грошай убухалі ў новы аграгарадок? Каму ён патрэбен? Калгас ніколі не разлічыцца за яго, тым больш, што церпіць страты, а яго даўгі дзяржаве пастаянна растуць. Лепш бы адрамантавалі як след старыя дамы і падвялі да іх прыродны газ. Да таго ж моладзь пакідае вёску, а людзі, якія адпрацавалі па 30-40 гадоў павінны пакутаваць ад холаду. Васіль Міхайлавіч Байкоў уважліва выслухаў усе скаргі і абяцаў знайсці грошы на закупку абсталявання для газіфікацыі дамоў. Прысутным было абвешчана, што работы пачнуцца прыкладна праз месяц. Памочнік дэпутата В. А. Бурдзей узяў пытанне пад кантроль і для сувязі з грамадзянамі пакінуў дэпутату Дабейскага сельсавета М. П. Ліскову нумар тэлефона. Пасля чаго пачаўся прыём грамадзян па асабістых пытаннях. Дарэчы, намеснік старшыні райвыканкама А. М. Мядзвецкі ўсе ж такі намякнуў жыхарам Амбросавіч пра нарыхтоўку дроў. Дровы на вёцы ніколі лішнімі не бываюць.

**А. Шчамлёў.**

# ДЭМАГРАФІЧНАЯ БЯСПЕКА АБО ФІЗІЧНАЕ ВЫЖЫВАННЕ?

Гісторыя развіцця еўрапейскіх народаў паказвае, што на працягу стагоддзя кожны народ пры больш-менш звычайных (сярэдніх) умовах існавання (гэта значыць улічваючы войны і моры) павялічыў колькасць свайго насельніцтва ў два разы. Тэрыторыя цяперашняй Рэспублікі Беларусь амаль у сем разоў большая за плошчу Бельгіі, але колькасць насельніцтва аднолькавае, што ў Бельгіі, што ў Беларусі. Ці напрыклад, тэрыторыя сучаснай Беларусі толькі на 19 адсоткаў меншая за плошчу Велікабрытаніі, але насельніцтва ў шэсць разоў меншае. Тэрыторыя цяперашняй Украіны амаль у тры разы большая за плошчу Беларусі, але насельніцтва больш у пяць разоў і г. д. У сярэднім поясе Еўропы такога анамальнага стану, як у Беларусі, не назіраецца ні ў адной краіне. Пагражальная дэмаграфічная становішча склалася і ў Шумілінскім раёне. Насельніцтва нашага раёна штогод змяншаецца на 500-600 чалавек. Варта адзначыць, што найбольш высокімі тэмпамі зніжаецца колькасць сельскага насельніцтва. Прычыны небяспечнай дэмаграфічнай сітуацыі вядомыя. За чатыры месяцы бягучага года ў раёне памёр 181 чалавек ( у адпаведным перыядзе 2008 года памерлі 147 чалавек). На першым месцы па прычынах смяротнасці, як і па ўсёй вобласці, - хваробы сістэмы кровазвароту ( 40,3% ). Другое месца займае старасць. Па гэтай прычыне пайшлі з жыцця 33 чалавекі. Усім памерлым было больш за 80 год. Насельніцтва раёна старэе: больш за 30% жыхароў – людзі пенсійнага ўзросту. На трэцім месцы – няшчасныя выпадкі, траўмы і суіцыды. За чатыры месяцы загінула 25 чалавек. Імклівa вырасла колькасць людзей, якія скончылі жыццё самагубствам. За апошні перыяд было зарэгістравана 11 выпадкаў суіцыду. Наш раён паставіў своеасаблівы рэкорд: 8,66 смяротных выпадкаў на адну тысячу насельніцтва ( пры абласным паказчыку 5,55 ) – самая высокая лічба ў вобласці. Безумоўна, не ўсё залежыць ад уладаў, дактароў і сацыёлагаў. Чалавек сам павінен весці здаровы лад жыцця, берагчы сваё жыццё, клапаціцца пра сваю будучыню. Аднак ёсць і яшчэ адна цікавы паказчык, які сведчыць аб дынаміцы развіцця нашага раёна. За два гады колькасць маладых людзей скарацілася на 400 чалавек. Сам старшыня райвыканкама В. А. Падляшчук вымушаны быў прызнаць, што вельми верагодна моладзь адчувае сябе ў нашым рэгіёне няўтульна і некамфортна. І хаця апошнім часам робіцца ўсё магчымае, каб моладзь заставалася працаваць і жыць у раёне, людзі доўга не затрымліваюцца. Найперш з'язджаюць маладыя высокакваліфікаваныя спецыялісты. Вальдэмар Антонавіч перакананы, што мала забяспечыць маладых толькі жыллём і стабільнай невялікай зарплатай. Да гэтага трэба дадаць годныя, сучасныя умовы працы і пражываня, выхадныя на сяле, службовы транспарт, магчымасць цікава правесці вольны час. Да таго на ўсё гэта не хапае фінанасаў. Пад пільным зрокам мясцовай ўлады ішло выкананне праграмы "Моладзь ШумілінШчыны" на 2006 – 2010 гады. І, як паказала практыка, ў цэлым па раёне з рэалізацыяй праграмы ў жыццё мясцовыя чыноўнікі пакуль што не справіліся.

**Алесь Прыбярэжны.**

# ЯК ЛОДКУ НАЗАВЕШ, ТАК ЯНА І ПАПЛЫВЕ

Маладыя людзі з лукашэнкавай арганізацыі БРСМ вырашылі пакатацца на катамаранах Анатоля Бычкова. У камерсантаў, як кажуць, грошы не пахнуць. Якая ім розніца, хто будзе катацца на іх лодках: камуністы, фашысты, нацыяналісты, лібералы – абы добра плацілі. І гаспадар аграэкасялібы ў сваю чаргу прыязна прадаставіў нашчадкам камсамолу плаваючыя сродкі. Падарожжа па рацэ Обаль арганізавалі нашы местачковыя кіраўнікі з раённага камітэта ГА БРСМ сумесна са сваімі калегамі з Лёзненскага раёна. Здавалася б, што тут заганнага, калі моладзь знаёміцца з суседзямі, з прыродным харaством нашага краю, ці проста адпачывае пасля цяжкой працы або складанай вучобы. Але "камітэтчыкі" маладзёвага саюза не маюць права адпачываць, як усе нармальныя абывацелі. Ім неабходна самазацвярджэнне сваёй наменклатурнай асобы на самым вышэйшым узроўні. Таму не выпадкова яны выкарысталі для гэтай меркантыльнай мэты гістарычныя падзеі Другой Сусветнай Вайны. Самі сябе назвалі камандай, а паход прысвяцілі чарговай прапагандысцкай акцыі савецкай бюракратыі: "65 гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Год роднай зямлі". Трэба ж паказаць усяму раёну, што "бэрэсээмаўцы" дабра разбіраюцца ў вялікай палітыцы і складанай, драматычнай і надзвычай трагічнай гісторыяграфіі беларускага этнаса. Толькі наўрад ці даведаюцца калі-небудзь неакамсамольцы пра сапраўдную гісторыю Беларусі. Навошта ім такія высокія паняцці як праўда, ісціна, свабода, дэмакратыя, нацыянальная самасвядомасць? Зараз за гэта можна дорага заплаціць. А эксплуатацыя дзіцячык казак пра расейскія імперыялістычныя войны зараз выгадна. Будзь прасцей, гнiся ніжэй, маўчы цішэй і будзеш жыць лепш за усіх!"Плюй на нижнего, толкай ближнего, пресмыкайся перед высшим" – вось яна асноўная формула поспеху савецкага чалавека. Менавіта для гэта служыць міф пра "вялікую айчынную вайну". Але само жыццё падказвае, чаго вартыя такія акцыі – яны прыводзяць да фармалізму, бяспамяцтва, паказухі, асмейвання нацыянальных ідэалаў і сімвалаў. Камуністы кожны дзень забівалі галовы народу гераізмам бальшавікоў, а што засталося ў свядомасці простага чалавека? Зараз ужо і анекдотаў пра Васіля Іванавіча Чапаева і Пецьку з Ганкай ніхто не расказвае. Кажуць, што самы лепшы доктар – гэта час, ён расставіць усё на свае месцы . На жаль, гэта ўсяго толькі іллюзія. Пакуль што не знайшлі сродкаў лячэння ад СНІДу, але амерыканскія вучоныя ўжо расшыфравалі генетычны код гэтага вірусу. Але дзве каланіяльныя заразы – расейшчына і савецтызм на Беларусі па-ранейшаму працвітаюць неўміручай славай.

**Аляксандр Шчамлёў.**


## АБ'ЯВЫ

***Прадам***

**Шумилино. Дом площадью 50 кв. м, участок 24 сотки, с гаражом (в гаражном кооперативе). Тел (02130) 4-14-05. Тел. 8-029-219-68-22 (МТС)**

**Автомобиль Мазда-625, 1986 г. в., 2.0D, ц/з, зимние шины, 1.500 у.е., торг.**

**Тел. 9-029-924-60-77. Тел. (02130) 3-46-30**

**Фиат-Мареа-Уикеад, 1997г.в. 1.6i бензин, тёмно-синий металлик, 6 л. на 100 км, конд. Климат, э/стёкла, ABS 2 airbag/ в отличном техсостоянии 3. 500 у/е/ Тел. 8-033-614-60 МТС.**


# Брацкія народы

У гарадскі пасёлак Обаль завітала дэлегацыя з Нямеччыны. Нямецкі горад Фрыдрыхсхафен і наша мястэчка Обаль яшчэ з савецкіх часоў з'яўляюцца гэтак званымі гарадамі-пабрацімамі. Замежных гасцей прымала старшыня раённага Савета дэпутатаў І. М. Новікава. Ірына Мікалаеўна наладзіла экскурсію для нямецкіх гасцей на Обальскі керамічны завод. У якасці экскурсавода на заводзе выступіла намеснік дырэктара прадпрыемства Г. І. Бабахіна. Яна распавяла дэлегатам аб сваім прадпрыемстве: ад гісторыі і пра тое, якую прадукцыю выпускаюць і куды прадаюць. Затым гасцей азнаёмілі з выставачнай залай Обальскага керамічнага завода. Пры чым турысты былі ў захапленні ад сюжэтных керамічных вырабаў. Некаторыя з вырабаў нямецкія госці атрымалі ў падарунак. Не забылі наведаць і музей обальскага падполля. Надалей візіцёры пабывалі ў Обальскай сярэдняй школе з дзіцячым прытулкам, дзе іх гасцінна прыняў дырэктар установы Аляксандр Мікалаевіч Штокін. Дырэктар у сваю чаргу арганізаваў для замежнай дэлегацыі экскурсію па школе. Абальчане мяркуюць, што наступная сустрэча пабрацімаў адбудзецца ў горадзе Фрыдрыхсхафен.

**С. Горкі.**

# ХАЙ ХОЦЬ СВІННІ ЗАЖЫВУЦЬ ПА-ЕЎРАПЕЙСКУ!

***Лукашэнка абвясціў перабудову і нават рэвалюцыю ў свінагадоўлі. Пра гэта заяўлена 7 жніўня ў Ляхавіцкім раёне.***

«У свінагадоўлі з вашай гаспадаркі пачынаецца рэвалюцыя. Мы выбралі галандскія і дацкія тэхналогіі ў якасці ўзору, паводле якога будзем перабудоўваць усю свінагадоўлю Беларусі», — паведаміў галоўны начальнік дырэктарцы аграпрадпрыемства «Белдан».

Таксама абяцана, што да 1 студзеня 2010 года цалкам на еўрапейскія нормы выйдзе будаўнічая галіна. Карацей, «з 2011 года, я упэўнены, мы будзем жыць, як у Еўропе, падцягнуўшы і іншыя напрамкі».

Няцяжка здагадацца, што гаворка ідзе выключна пра галіны эканомікі. Тут кіраўніцтва краіны відавочна саспела да высновы, што «вось узор... нічога прыдумляць не трэба, мы ўжо бяром гатовыя тэхналогіі. Сёння іх трэба выцягваць з Еўропы».

Заўважце: калі датычна замежнай палітыкі нядаўна абвешчана, што мы, маўляў, не будзем рабіць выбар між Расіяй і ЕС, то ў галіне тэхналогій альтэрнатывы няма.

У свінагадоўлі, як бачым, загадана без роздуму браць галандскія і дацкія ўзоры. Будаўнікі таксама мусяць арыентавацца на заходнія стандарты.

Наверсе выдатна разумеюць, што Расія нас не мадэрнізуе. З ёй застаецца хіба вазваць за рынак збыту пераважна састарэлага тавару.

Што ж, настрой на гаспадарчую мадэрнізацыю, калі адкідаецца ўсялякая ідэалагічная лухта, можна толькі вітаць.

Але згадваецца нядаўні выступ Лукашэнкі перад кіраўнікамі дыпмісій, калі ён імпэтна даводзіў, наколькі шкодна ўкараняць у нас заходнія ўзоры дэмакратыі. Маўляў, «важная ды патрэбная не вонкавая "дэмакратычная" абалонка. І тым болей не прывезеная і не накінутая звонку. Такая спехам прывітая дэмакратыя няўстойлівая…». Яшчэ болей, «такія "мічурынскія" практыкаванні робяць цяжкапапраўную шкоду краіне, эканоміцы і, у рэшце рэшт, народу».

Карацей, у свінагадоўлі тэхналогіі краін ЕС — самае тое, а вось у палітыцы — гарай за свіны грып.

Мо хто патлумачыць уцямна: чаму тутэйшым свінням еўрастандарты пасуюць, а вось тутэйшаму люду — шкодныя?

Калі ж сур'ёзна, то вялікае пытанне, наколькі запрацуюць тыя суперпупертэхналогіі, калі вёска спілася, а начальства ведае толькі мацюкі ды пугу.

**Аляксандр Класкоўскі.**

# Прызначаная дата правядзення

Адбыўся чарговы аргкамітэт Беларускага еўрапейскага форуму пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Руха "За Свабоду" Юрася Губарэвіча. Галоўным вынікам паседжання стала прызначэнне даты правядзення Форуму – мерапрыемства мае адбыцца 14 лістапада 2009 года.

Да пачатку лістапада ў Беларусі мусяць прайсці рэгіянальныя сходы, на якіх будуць вылучаныя дэлегаты на Беларускі еўрапейскі форум. Цяпер пададзена 86 заявак на правядзенне сходаў па ўсёй краіне. Першыя рэгіянальныя сходы ўжо адбыліся ў Смалявічах і Клецку. Ад гэтых рэгіёнаў дэлегамі былі абраныя сем чалавек.

Аргкамітэт Беларускага еўрапейскага форуму зацвердзіў квоту прадстаўнічасці дэлегатаў, ўзор сымболікі і дакументаў Форуму. Цягам бліжэйшага тыдня распачне працу сайт форума – на ім можна будзе не толькі знайсці інфармацыю пра само мерапрыемства, але і зарэгістравацца сябе як удзельніка рэгіянальнага сходу па вылучэнні дэлегатаў. Арганізатары разлічваюць, што агулам ў Форуме возьмуць удзел каля тысячы чалавек.

Бліжэйшым часам на Беларускі еўрапейскі форум таксама будуць запрошаныя замежныя госці: дэпутаты Еўрапейскага парламенту, прадстаўнікі іншых структураў Еўразвязу і дыпламатычнага корпусу краінаўЕЗікраінаў-удзельніц Усходняга Партнёрства, палітыкі, прадстаўляючыя нацыянальныя парламенты. Нагадаем, што адно з першых запрашэнняў было перададзенае Старшыні Еўрапейскага парламенту Ежы Бузэку непасрэдна ад лідэра Руху "За Свабоду" Аляксандра Мілінкевіча.

Беларускі еўрапейскі форум мае на мэце мабілізаваць прыхільнікаў і аб'яднаць патэнцыял беларускіх праеўрапейскіх сілаў, а таксама падтрымаць паўнавартасны ўдзел Беларусі ў праграмах еўрапейскага супрацоўніцтва і інтэграцыі.

# «ИРА, У МЕНЯ ЗАСКОК»

**Кирилл Борисенко, «Белгазета»**

На недавнем совещании с руководителями белорусских загранучреждений Александр Лукашенко посетовал, что секретари в приемных до сих пор бросают трубки телефонов, услышав иностранную речь. «Как же мы собираемся побеждать на иностранных рынках? Ждать, пока они заговорят по-нашему? То, что в стране нужна системная кадровая ротация, это факт», - подытожил президент. Корреспондент «БелГазеты», позвонив в приемные руководителей ряда белорусских предприятий, задал один вопрос: «I'd like to talk to someone about your investment portfolio and discuss some plans about creating a joint-venture with your enterprise» («Я бы хотел поговорить о вашем инвестиционном портфеле и обсудить планы создания совместного предприятия»).

**РУП «Оршанский инструментальный завод»**

